Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 12. Варыянт 4. Ч.1**

**Білет № 12. Практычнае заданне. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР.**

**Распрацавала**: Сурконт Таццяна Мар'янаўна, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Сярэдняя школа №8 г. Ліды»

**На аснове прадстаўленых матэрыялаў адкажыце на пытанні:**

1. На падставе крыніцы 2 назавіце горад, у якім праводзіўся Народны сход Заходняй Беларусі. Якое значнае рашэньне было прынята на Народным сходзе?
2. На падставе крыніцы 1 выкажыце меркаванне аб тым, як насельніцтва ставілася да правядзення выбараў у Народны сход Заходняй Беларусі. Прывядзіце два аргументы, якія даказваюць ваш пункт гледжання.
3. На падставе крыніцы 3 ахарактарызуйце асноўныя мерапрыемствы па арганізацыі народнай адукацыі ў заходніх абласцях БССР. Якая іх асноўная мэта?
4. На падставе крыніцы 3 назавіце тры адрозненні сучаснай сістэмы адукацыі ад той, якая склалася пры ўключэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР.

**Крыніца 1.**
**На вуліцы адной з вёсак Пружанскага раёна ў дзень выбараў у Народны Сход Беларусі. 22 кастрычніка 1939 г.**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца 2.**
**Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР (17 верасня – 14 лістапада 1939 г.)**




**Крыніца 3**
**З Пастановы ЦК КП(б)Б "Аб мерапрыемствах па арганізацыі народнай адукацыі ў заходніх абласцях БССР"**

*Мінск, 2 снежня1939 г.*

Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі пастанаўляе:

1. Абвясціць усе школы заходніх абласцей БССР дзяржаўнымі ….

Увесці на ўсёй тэрыторыі заходніх абласцей Беларускай ССР усеагульную, абавязковую, бясплатную адукацыю. У гарадах - за 7 класаў сярэдняй школы, на вёсцы - за пачатковую школу.

2. Перабудаваць сістэму народнай адукацыі ва ўсіх школах заходніх абласцей БССР у адпаведнасці з савецкай сістэмай народнай адукацыі…

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

3. Лічыць, што асноўная маса школ у заходніх абласцях БССР павінны быць беларускімі.

Пераход на беларускія школы не зацягваць, аднак здзяйсняць яго паступова, па меры забеспячэння школ падручнікамі і кваліфікаванымі выкладчыкамі-беларусамі.

Абавязаць партыйныя, савецкія органы і аддзелы народнай адукацыі разгарнуць прапагандысцкую і агітацыйную працу па ліквідацыі грэблівага стаўлення да беларускай мовы, якая прывівалася кіруючымі коламі і нацыяналістычнымі элементамі ў Польшчы.

Асудзіць няправільныя дзеянні некаторых работнікаў аддзелаў народнай адукацыі, якія пераводзяць школы на беларускую мову без папярэдняй падрыхтоўкі. Выкладанне беларускай мовы часта даручаецца польскім выкладчыкам, якія толькі дыскрэдытуюць беларускую мову і беларускую культуру.

4. Увесці вывучэнне рускай мовы ў беларускіх школах і школах нацыянальных з 3-га класа: вывучэнне беларускай мовы ў рускіх школах увесці з 3-га класа; а ў школах нацыянальных з 2-га класа.

5. … абвясціць дадатковы набор у школы з тым, каб ахапіць усеагульным навучаннем, у першую чаргу, дзяцей працоўных, сялян і працоўнай інтэлігенцыі.

6. … разгарнуць сетку школ для дарослых і школ па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці для працоўных гарадоў і вёсак заходніх абласцей БССР.

7. Стварыць з 1-га студзеня1940 г. педагагічныя інстытуты ў гарадах Пінску, Беластоку, Баранавічах, Гродне і педагагічныя вучылішчы ў гарадах. Беластоку, Гродне, Навагрудку, Брэсце, Пінску і Маладзечне, а таксама два дашкольныя педагагічныя вучылішчы ў гарадах Лідзе і Ваўкавыску.

8. … разгарнуць на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі сетку дзіцячых дамоў і дашкольных дзіцячых устаноў.